Беларускі дзяржаўны архіў-музей
літаратуры і мастацтва



# Міхась Васілёк:
# «Я ранне бачыў»



1

Р. С. Ф. С. Р.

Н. К по Пр.
ЕДИНАЯ ТРУДОВАЯ
СОЦИАЛИСТИЧЕСКАЯ
Советская
ШКОЛА-КОММУНА
Для взрослых
2-й ступени № 1-й
2-го июля 1921 г.
№ 288
г. Козлов, Тамб. г.

Удостоверение.

Удостоверение это выдано [illegible] рожденному [illegible] Школьным Советом 1-й Козловской Советской школы для взрослых 2 й ступени в том, что он окончил полный курс школы 2-й ступени, в 1921 г.

Вышеозначенным лицом прослушаны следующие предметы:

1) Русский язык, литература и психология.
2) Математика (алгебра, геометрия, тригонометрия)
3) Физика.

**Пасведчанне аб заканчэнні школы-камуны для дарослых у Казлове, 1921**
*Ф. 2. Воп. 1. Спр. 26. Арк. 1*



**Асабісты фотапартрэт. 1920-я**
*Ф. 2. Воп. 1. Спр. 44. Арк. 1*


Будзьце вы мужнымі.

Моладзь — ты, першыя промені сонца,
Красні маёвыя у роднай старонцы —
Моладзь, то дзеці вясны кучаравай —
Песні ~~[illegible]~~ ле ў расквітнеўшай дуброве.

Трывога ў жыцці вам спаткаць давядзецца —
Кволае дрэва без ветра сагнецца.
Будзьце вы мужнымі, смелымі, годнымі
~~Стаць~~ Быць для Айчыны ~~[illegible]~~ заўсёды прыгоднымі ~~[illegible]~~.

Трэба вучыцца — навука і праца
Нам дапамога з нядоляй змагацца.
Веду здабудзець — з гэтым багаццем
Служкай па свеце не будзем цягацца.

Веду здабудзеце — з гэтаю сілай
Вольнымі станем мы ў поруч з усімі.
Споўніце, мілыя, споўніце гэта —
Скажаце „[illegible]чырае „дзякуй" паэту.

1925 г.

**«Будзьце вы мужнымі» – адзін з найбольш ранніх вершаў Міхася Васілька**

*Ф. 2. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 1*

# Я ранне бачыў.

Я ранне бачыў — ноч знікала,
Паападалі зоры ў рунь
І ўрачыста закувала
Зязюля, будзячы зару.

Я ранне бачыў — ноч знікала,
Я шчэ драмаў аер з чаротам —
Як нехта пэндзлям так дбала
Паклаў на небе пазалоту.

Я ранне бачыў — ноч знікала,
Густы туман пачаў радзець.
Птушыны хор вясёлым дыхам
Вітаў прадвесня новы дзень.

Я ранне бачыў — ноч знікала
Ужо першы сонечны прамень
На саламяных, шэрых стрэхах
~~Лёду~~ Ласкаў збуцвелы жоўты мох...

Я ранне бачыў — ноч нясмела
Зышла з усіх сцэжын, дарог...
На сенажацях сталь касы
У ~~[illegible]~~ рытме працы зазвінела!

Над нашым сонцам знікла ноч
З панурым свістам каганоў!
Не будуць цемры галасы
Гурэць пагрозаю для нас —
Мы бачым — блізіцца той час...

1927 г.

**«Я ранне бачыў», 1927**

*Ф. 2. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 20*

~~35~~ 32

# Ноч.

Ціхая ноч над краінаю роднаю
Сны неразгадныя сніць,
Мігаюць святла у небе бязмежным
Зорак далёкіх агні
Не зварухнецца спакойны, высокі
Як зачарованы бор —
Выткаў мароз на галінах лахматых
Пышны, квяцісты узор.
Уецца змяёю па лесе дарога,
Снег пад нагамі, як пух —
Срэбная іскра яго усміхаюцца
Месяца ў небе сярпу.
Хочацца грудзі расхрыстаць прад зорамі,
Высмактаць з іх мо' цяжар —
Сэрца за край, за народ спаняверана
Можа пакіне дрыжаць.
Хочацца верыць у шэпты прарочыя
Гэтай ~~святой~~ лясной цішыні...
Так, мы спаткаем з табой калісь ночка
Лепшыя, шчасныя дні!

1927 г.

**«Ноч», 1927**
*Ф. 2. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 32*

6 7 38

Шляхом цярністым

Шляхом цярністым повазаг
Нёс гарох працоўных...
Не даваў скачанці цяжкай нок
Хвіліну хоць адну...

Скрывіць ~~тыло~~ спіна пад цяжарам —
Нагружаным бядой...
Дзень будучыні скажа нам,
Чаго варт працы бой.

Ну што-ж, таварыш, годзі млець!
Плячыма ўзварухні —
Бадзёра стойка трэба ўмець
~~Спаткаць~~ Здабыць свабоды дні.

Ўдуць яны... душа гарыць
Жаданнем толькі тым:
Разбурыць смела свет стары —
~~Пламем дзьмухнуць свет стары~~
~~Прад сонцам~~ Дарогу маладым!

Ў над магілай горных дзён,
Якім больш не паўстаць,
Рукой мазольнай крыж — праклён
З пагардам устяць!

1929 г.

**«Шляхам цярністым», 1929**
*Ф. 2. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 6*

* * *

I.

Неспакойна штось на сэрцы,
Можа песню запяю я!
Смейся, браце, ў вочы смерці...
Неспакойна штось на сэрцы:
Буры прагну... эх, паверце,
Ночка вечна не пануе...
Неспакойна штось на сэрцы,
Можа песню запяю я!

II.

Там за борам, цёмным гаем
Віхраць палымяны пажары,
Нехта крыкі з агня ўздымае
~~З агня крыкі нехта ўздымае —~~
Там за борам, цёмным гаем! за
Дзе музыкі — марша ўграем!
Што-ж, хай сцюжа б'е па твары...
Там за борам, цёмным гаем
Віхраць палымяны пажары.

III.

Расчупрыла сонца косы —
Знаць дзянёк на славу будзе.
Бытцам залатыя палосы
Расчупрыла сонца косы.
Чую гоман, адгалосы —
Радасць рве на часткі грудзі...
Расчупрыла сонца косы
Эх, дзянёк на славу будзе.

1931 г.

**«Неспакойна штось на сэрцы», 1931**

*Ф. 2. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 40*



З сялянскіх ніў.

З сялянскіх ніў прынёс я вам жывыя адгалосы
— Пах руні кучаравай...
Як сонца раніцой, на дол цярусіць росы,
Сялібі птушыны гімн з абуджанай дубровы
Прынёс я вам сюды.
У залішах маладых
Шапоча вечар штосі бярозцы белатварай;
З зарніцай ранняю падняўшыся над папарам,
Звініць, пяе жаўрук.
Пяе, як выйдзе зноў ратай
Гарачым потам тут барозны паліваць,
Пяе, як новае жыццё
На вогнішчы старым пачне ён будаваць —
Пяе пра Першы Май!
З сялянскіх ніў прынёс сюды
жывыя адгалосы,
— ~~Пах~~ Іх зліць хачу з машын сталёвых свістам!
Я сын мільёнаў шэрых, бедных, босых...
Ідзём уперад мы
З заданнем урачыстым:
— Здабыць правы жыцця!
Прыйдуць вякі...
Аб нашых днях гісторыя напіша.

(На адв.)

**«З сялянскіх ніў», 1930-я**

*Ф. 2. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 10*

25

## Пасля катавання

~~Ў не скажа майскі вечар~~ (прысв. Міколе Л.)

64
40

Распыліў па-небе хмары вецер,
Пыл з дарогі калыхнаў вецер –
Пшгэ раз уздрыгнула лісцём асіна
Ды схаваўся ў куст, як кошка, звінна.

А ў кусце там гармошка ў цвеце,
Ў вясной з ёй цалаваўся вецер...
Ўшоў Мікола позна штось да дому
І што думаў? думаў, эх, вядома...

Каб дабрэсці да старэнькай хаткі –
Любым сынам быў адзін у маткі...
Кроў прарвалася ізноў, а хустка бела
Пачырванела, сцягам чырванела...

Ў не скажа майскі вечар людзям,
Як зямелька цалавала грудзі...
А ці скажа бяроза пахіла,
Колькі год зязюля налічыла.

Шапацелі там кусты наўкола –
Шкадавалі моцна знаць Міколу.
І падкраўшыся ціха, ціха вецер
Пот з самлелага хлапчыны выцер...

Шчабятаў вясёлы салавейка –
Быў чароўны першамайскі вечар...

1936 г.

**«Пасля катавання», 1936**

*Ф. 2. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 25*

Прыдзе ўз'яднання час.

28

~~104~~ 57

Можа пяў-бы я аб ружах і прадвесні –
Пра хараство нябёс, пра ласку зораў,
Але жыццё наша не гэтых прагне песняў,
Калі галодных гімн грыміць, як хвалі мора.

Красу я бачу іншымі вачыма –
Яна у бунце дня – да сонца нас вядзе,
Каб шлях пакут і ноч пакінуць за плячыма...
Глядзі, як горнай зморы цень
Пазавугллю родных хат залёг
Ў тчэ свае жалобныя тканіны.
Дарэмна... ўжо імкнецца золак на палёх –
Звястун цяпла і сонца прыгнечанай краіны!
Выходзьце, сейбіты, ралля даўно гатова
Ўсейце смела, вы (няхай красуе рунь,
А саранчы мы скажам апошняе слова:
Для тваёй гібелі) не пашкадуем рук!
Не запярэчыш мне – закон жыцця не згіне,
Хоць можа гніль на час змуціць крынічны бег,
Але бурлівы цяг жывой празрыстай плыні
Асадзіць бруд на дно, як сонца сплавіць снег...

Пяю браты, я вам, пакрыўджаным, галодным –
Не! не зробіць з байца пакорнага раба!
Старонка, мілая, будзеш і ты свабодна,
Прыдзе ўз'яднання час – заломім свой мы боль!

1937 г.

**«Прыдзе ўз’яднання час», 1937**

*Ф. 2. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 28*



**Міхась Васілёк пасля вяртання з палону, 1941**

*Ф. 2. Воп. 1. Спр. 44. Арк. 9*

1/ 50

# Паварот з няволі.

Я застаў цябе, вёска,
Не такой, як была ты —
Кроў і слёзы расплёскаў
Люты вораг ля хатаў.

Не пачуў песні жнеяў —
Усё маўчала панура,
Дымам неба гарэла
Пасля грознае буры...

Ужо размятвала лета
Прадзі срэбнае ніці,
Васількі мне прывітам,
Шапацелі у жыце.

У садку невялікім,
Аж да хаткі парога,
Апроч вырклаў дзікіх,
Не застаў я нічога...

Толькі пышныя ліпы,
Як сцяжка адзіна,
Успамінам былі мне —
(Стары бацька садзіў іх...)

Мне яны расказалі,
Як чакаў з вайны сына —
Паглядаючы ў далеч,
Да апошняй хвіліны.

**«Паварот з няволі», 1942**

*Ф. 2. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 50*

58

* * *

Туман ападаў на лагчыны
Вячэрняю, летняй парою.
Смяротныя раны хлапчыны
Сцякалі гарачай крывёю...

Паўзлі па дарозе, як гады
Зямлі непакорнай ката,
А ён — нечакана — з засады
Пад ногі ім кінуў гранату!

Ён помсціў за родныя вёскі,
Сясцёр і братоў скатаваных...
Шапочуць, шапочуць бярозкі
Аб славе яго — партызана.

1944 г.

**«Туман ападаў на лагчыны», 1944**

*Ф. 2. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 28*

83

125

# Дзень перамогі.

З грознымі лязгам зброі,
Жалезам і сталі –
Рушылі фашысты у паход.
Каб ~~зверскую~~ шаленства смагу
Крывёй заспакоіць –
Яны рушылі на Усход!

Першая ахвяра:
Сцякала крывёю
~~Родна~~ Маці, дарагая Беларусь...
Заглуміла ~~наша~~ банда,
Дымамі пажараў –
– Нашай радасці зару.
Усё, што здабылі мы
Упартай працай –
Руйнавала смерці саранча.
Каты разрывалі
Мілы край, любімы –
Секлі вастрыём мячоў.

Лямант днём і ноччу,
Праклёны і гора –
Мірнага народа глухі стогн...
– Выпікалі дзеткам
Блакітныя вочы,
Матак гналі у палон.

Ярка запалалі
Крамлёўскія зоры
Як сказаў народу правадыр:
– У свеце няма сілаў
Такіх, каб зламалі
Камунарскія рады!

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА

**«Дзень перамогі», 1940-я**

*Ф. 2. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 83*



2.

~~108~~
~~119~~
77

Вось толькі аднаму—не тое...
Ўспомніў дзед вясёлы час,
Калі прад самаю вайною
У іхняй вёсцы быў калгас.

Ён сам спаборніцтва заводзіў—
Чатыры днёўкі вырабляў!
~~Ого-й~~ Бывало збожжа як удодзіць
Ну проста, гнецца аж зямля.

Усё дазбураў гад, люцыпар—
Каб век яго не бачыў свет!
Ў шчодрай лазнкаю сыпаў
Да злосцю сплёўваючы дзед.

Але пара, ~~даўно~~ ізноў пара
Калгас закласці, паглядзець—
Яшчэ дальбог пайду араць!
—Казаў стары і маладзеў...

3.VIII-47 г. ~~Міхась Васілёк~~

**«Вось толькі аднаму – не тое…», 1947**

*Ф. 2. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 77*


Культура.

На яву, а не ў во сне, — з'ява!
У маю хату на вясне —
Скуль, не ведаю я й чаго
Завітаў аднойчы госць
Чалавек пачаў з парога,
(Праца, хатка ў тры шагі)
З прывітання: — Ёсць здарова?
— Што-ж, пачатак не благі
Стаўрыў ўздя — гарачай хваляй
Стужка ядуча абдала
Стаў прасіць: праходзьце далей —
Калі ласка да стала!
Госць абвёў вакол вачыма,
Шаг ступіўшы — стаў ізноў
Зварухнуў неяк плячыма
Кінуў позірк на вакно
І сказаў з выразам хмурным → шапку
Як у вас тут не культурна...
Ля стала вось лопсак блізка,
Вокна нізкія — совсем
Столяванне так-жа нізка...
І на лопсак грузна сеў!

**Чарнавы варыянт сатырычнага верша «Культура», 1950-я**

*Ф. 2. Воп. 1. Спр. 9. Арк. 6*

Гор. Гродна, вул. Савецкая, 12,
рэдакцыя газеты " Гродзенская праўда",
паэту Міхасю Васільку.

Паважаны тов. Васілёк!

Пішуць Вам вашы землякі загадчык Глінянскай хаты-чытальні Мышко Л.П. и сакратар Глінянскага сельсовета Сытых М.А.

З паведамленняў друку мы даведаліся, што ў гэтым годзе вышаў новы зборнік Вашых твораў. Але набыць яго мы не змаглі з той прычыны, што ў кніжны магазін г. Скідэля завезлі іх толькі некалькі экземпляраў. Не ўдалося нам купіць Ваш зборнік і ў г. Гродна.

Чытачы нашага сельсовета вельмі цікавяцца і шчыра вітаюць Вас, свайго земляка, з выхадам у свет Вашага новага зборніка твораў.

Просім Вас выслаць нам па зборніку Вашых твораў з Вашым аўтографам.

З гарачым прывітаннем к Вам

Вашы землякі

Шліце па адрасу:

Скідэльск р-н,
Глінянскі с/с.,
в. Гліняны
Глінянская хата-чытальня,
Мышко Л.П.

**Ліст Міхасю Васільку ад землякоў, 1959**

*Ф. 2. Воп. 1. Спр. 25. Арк. 9*



**М.Васілёк (у цэнтры) каля сваёй хаты ў вёсцы Баброўня Гродзенская раёна. Канец 1950-х гг.**

*Ф. 2. Воп. 1. Спр. 45. Арк. 3*



**Міхась Васілёк з сям'ёй, 1954**

*Ф. 2. Воп. 1. Спр. 45. Арк. 1*



**Міхась Васілёк са старэйшым сынам Леанідам, 1959**

*Ф. 2. Воп. 1. Спр. 45. Арк. 2*



ПРЭЗІДЫУМ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Тав. Касцевіч Міхаіл Іосіфавіч

За актыўны ўдзел і поспехі ў развіцці мастацкай самадзейнасці ў калгасах і саўгасах рэспублікі

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 1 чэрвеня 1960 г. узнагароджан Пачотнай Граматай Вярхоўнага Совета.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР (В. КАЗЛОЎ)

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР (Д. ЛУКАШЭВІЧ)

«6» чэрвеня 1960 г.

№ 7084

**Ганаровая грамата Вярхоўнага Савета БССР, 1960**

*Ф. 2. Воп. 1. Спр. 32. Арк. 2*



**Міхась Васілёк атрымоўвае Ганаровую грамату Вярхоўнага Савета БССР ад Д.А.Лукашэвіча, 1960**

*Ф. 2. Воп. 1. Спр. 53. Арк. 1*

## *Цытаты з твораў Міхася Васілька:*

«Трэба вучыцца — навука і праца
Нам дапаможа з нядоляй змагацца» (1925)

«Век дваццаты, век не з горшых...
Абы грошы, толькі грошы» (1925)

«Гэй, людзі, людзі — хто жывы,
Падайце голас! Спіце вы?» (1929)

«Бадзёра стойка трэба ўмець
Здабыць свабоды дні» (1929)